# КУЛЬТУРА ЖЫЦЦЕЗАБЕПЯЧЭННЯ ПАСЛЯВАЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ ЯК ПРАДМЕТ АЙЧЫННАЙ ЭТНАЛОГІІ[28]

# THE CULTURE OF LIFE SUPPORT OF THE POST-WAR BELARUSIAN VILLAGE AS A SUBJECT OF NATIONAL ETHNOLOGY

Сумко Алена Вячаславаўна,

Полацк, Беларусь

Ключавыя словы: культура жыццезабеспячэння, беларуская вёска, вусная гісторыя.

Рэзюмэ. Вылучэнне і даследаванне праблематыкі жыццезабеспячэння беларускай пасляваеннай вёскі прадстаўляецца перспектыўным ракурсам этнічнай культуры ў цэлым і можа выступаць як асобны прадмет этналагічнага даследаванняў

---

[28] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РФФД “Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX - начала XXI века”, дамова № Г20Р-095/

Keywords: life support culture, Belarusian village, life strategies, oral history.
Summary. The identification and study of the problems of life support of the Belarusian post-war village is a promising perspective of ethnic culture as a whole and can act as a separate subject of ethnological research.

У апошнія гады ў айчыннай этналогіі побач з класічнымі народазнаўчымі тэмамі развіваюцца новыя напрамкі даследаванняў. У выніку інтэнсіфікацыі навуковай працы ў галіне вуснай гісторыі, адным з перспектыўных ракурсаў этнічнай культуры паўстае даследаванне культуры жыццезабеспячэння беларускай вёскі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага аднаўлення.

Культура жыццезабепячэння (КЖ) з’яўляецца важнейшым аспектам этнічнай культуры, яна акумулюе жыццёвы вопыт і стратэгіі ўзаемадзеяння этнаса з этнічнай (прыроднай) тэрыторыяй, неад’емна звязана са спецыфікай гаспадарчай дзейнасці, сацыяльнай арганізацыяй і карцінай свету ў цэлым. Аналіз КЖ дазваляе больш поўна ахарактаразаваць матэрыяльную, сацыяльную і духоўную культуру этнаса і асаблівасці яго гістарычнага развіцця. У класічным разуменні культура жыццезабеспячэння ўключае такія кампаненты, як жыллёва-пасяленчы комплекс, адзенне, сістэму харчавання – тое, што непасрэдна накіравана на падтрыманне жыццядзейнасці людей [1, с.8]. Нягледзячы на тое, што пералічаныя кампаненты адносяцца да матэрыяльнай культуры, іх нельга разглядаць у кантэксце толькі ўтылітарнай прагматыкі, бо само разуменне “культура” мае больш шырокі кантэкст. Калі браць вызначэнне тэрміна, то пад культурай жыццезабеспячэння разумеецца “ўзаемазвязаны комплекс асаблівасцяў вытворчай дзейнасці, дэмаграфічнай структуры і рассялення, працоўнай кааперацыі, традыцый спажывання і размеркавання, г.зн. экалагічна абумоўленых формаў сацыяльных паводзін, якія забяспечваюць чалавечаму калектыву існаванне за кошт рэсурсаў канкрэтнага асяроддзя пражывання” [2].

Ракурс даследавання КЖ паступова абнаўляецца і змест дадзенага тэрміна пашыраецца. Прадметнае поле КЖ уключае ў сябе праблематыку жыццёвых каштоўнасцей у сялянскіх калектывах, выпрацаваныя сялянствам механізмы пераадольвання цяжкасцей ва ўмовах трансфармацыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага ладу. Такім чынам, стае магчымым вылучыць асобны напрамак даследаванняў – вывучэнне культуры жыццезабепячэння беларускай вёскі ў перыяд пасляваеннага аднаўлення, бо нягледзячы на адносна невялікія храналагічныя межы, гэта быў пераломны і шмат у чым вырашальны перыяд у этнічнай гісторыі беларусаў, звязаны з радыкальнымі зменамі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага характару. Гэта перыяд пасляваеннага аднаўлення сельскай гаспадаркі і калгаснай сістэмы ва ўсходніх раёнах Беларусі, паступовая ліквідацыя аднаасобных гаспадарак і пераход да прымусовай калектывізацыі ў заходніх раёнах, што суправаджалася разбурэннем традыцыйнага сялянскага ладу жыцця. У цэнтры гэтых падзей быў чалавек, які спрабаваў адаптавацца да складаных, а іншы раз экстрэмальных абставінаў, рэалізаваў увесь свой патэнцыял дзеля выжывання і стварэння прымальных жыццёвых умоў для ўласнай сям'і. Менавіта антрапалагічны падыход да вывучэння гаспадарча-эканамічных аспектаў этнічнай культуры ўяўляецца перспектыўным пры комплексным аналізе практык жыццезабеспячэння беларускай вёскі. Пры гэтым гаворка ідзе не толькі аб матэрыяльнай базе жыццезабеспячэння, гаспадарчай вытворчасці, промыслах, рамёствах, але і пэўнай

сістэме анталагічных каштоўнасцяў, якія праецыраваліся на сферу народнай педагогікі, медыцыны, абрадавыя практыкі і фальклор.

Комплекснае даследаванне такой складанай даследчай праблемы як культура жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі вымагае полідысцыплінарнага падыходу і выкарыстанне шырокага кола крыніц: архіўных дакументаў, матэрыялаў вуснай гісторыі, фотаматэрыялаў, этнаграфічных крыніц, якія дапаўняюць адзін аднаго. Архіўныя дакументы дазваляюць зразумець кантэкст падзей, утрымліваюць каштоўную інфармацыю аб некаторых аспектах паўсядзённага жыцця: матэрыяльная незабяспечанасць, узаемаадносіны з уладнай вертыкаллю, матывацыя парушэнняў Статута сельскагаспадарчай арцелі і нават магчымыя варыянты вырашэння праблем пасляваеннай вёскі з пункту гледжання звычайнага вяскоўца. Аднак, калі размова ідзе пра жыццезабеспячэнне беларускай паваеннай вёскі, то ў цэнтры даследчай увагі знаходзіцца чалавек, таму, менавіта сведчанні рэспандэнтаў дазваляюць рэканструяваць з дастатковай доляй верагоднасці асобныя элементы штодзённасці: сістэму харчавання, аднаўленне жыллёвага комплексу, асаблівасці задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэбаў, вызначыць стратэгіі і адаптыўныя практыкі будзённага жыцця ў складаных эканамічных умовах. Успаміны даюць магчымасць зразумець, як этнічны вопыт гаспадарчых практык быў рэалізаваны ў пасляваенны час, якія рэсурсы выкарыстоўвалі для аднаўлення сваёй гаспадаркі, як успрымалася сельскім насельніцтвам сацыяльна-эканамічныя трансфармацыі (асабліва гэта было актуальна для насельніцтва Заходняй Беларусі), як мяняліся ментальныя ўстаноўкі, каштоўнасныя арыенціры і як гэта ўплывала на культуру жыццезабеспячэння вясковага насельніцтва ў цэлым.

Неабходна адзначыць, што на сённяшні момант большасць рэспандэнтаў – гэта пераважна жанчыны 1930-40-х гг., якія былі ў разглядаемы перыяд дзецьмі або падлеткамі. Пэўная частка даследчыкаў ставіць пад сумнеў дакладнасць падобных успамінаў і саму магчымасць рэканструкцыі пасляваеннай рэальнасці на аснове дзіцячых успамінаў. Аднак, па сцвярджэнні псіхолагаў, сацыяльная памяць пачынае фармавацца ўжо з 4-гадовага ўзросту і ўключае ў сябе фрагментарныя, найбольш эмацыйна афарбаваныя эпізоды, больш асэнсаванымі, суадноснымі з гістарычным кантэкстам дзіцячыя ўспаміны становяцца ў 9-гадовым узросце і затым трансфармуюцца ў памяці дарослага пад уздзеяннем сацыякультурных фактараў [3, с.282]. Да таго ж надзвычай складаныя жыццёвыя перыпетыі прымусілі пасталець раней часу цэлае пакаленне. Будучы дзецьмі, яны перажылі жахі Вялікай Айчыннай вайны, страту блізкіх, а потым на роўні з дарослымі, ва ўмовах разрухі і голада, уключаліся ў вытворчыя працэсы.

Наступствы ВАВ былі катастрафічнымі для Беларусі. Чалавечыя і матэрыяльныя страты, знішчэнне тысячы паселішчаў, скарачэнне пасяўных плошчаў, ураджайнасці – адмоўна адбілася на стане пасляваеннай вёскі. У вельмі складаных умовах апынуліся жыхары раёнаў, тэрыторыя якіх стала эпіцэнтрам карных экспедыцый акупантаў. Успаміны вяскоўцаў фіксуюць, што вельмі актуальнай была праблема фізічнага выжывання на спустошанай тэрыторыі, калі пагроза гвалтоўнай смерці знікла, а на першае месца выйшла пагроза смерці ад голаду. Пры прадметным разглядзе наступстваў акупацыі і ваенных дзеянняў выяўляюцца рэальныя “зоны бедства” і “зоны адноснай стабільнасці”, у межах якіх практыкі культуры жыццезабеспячэння у паваенны час адрозніваліся. Істотным фактарам, які адбіваўся на ўзроўні жыцця, з’яўляліся пасляваенныя няўроды, якія

былі вынікам неспрыяльных умоў надвор'я ў 1945 і 1946 гадах, а таксама дзяржаўная палітыка, накіраваная на максімальнае выкачванне рэсурсаў з вёскі. Складаная пасляваенная рэчаіснасць выклікае пытанні, звязаныя з тым, як людзі забяспечвалі прымальныя жыццёвыя ўмовы ў межах даступнай рэсурснай базы і геаграфіі пражывання. У прадметным поле культуры жыццезабепячэння пасляваеннай беларускай вёскі найбольш рэльефна выдзеляюцца наступныя кампаненты: матэрыяльнае становішча вёскі заходніх і ўсходніх абласцей Беларусі, яе этнадэмаграфічная і сацыякультурная характарыстыка; жыццёвыя стратэгіі і адаптыўныя практыкі сялян-калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў; сялянскія легальныя і нелегальныя промыслы і іх роля ў павышэнні дабрабыту вясковага насельніцтва; сістэма харчавання і вясковая гастранамія; народная медыцына паваеннага часу. Неабходна адзначыць, што наратывы пра жыццё пасля вызвалення ад нацыстаў і перыяд пасляваеннага аднаўлення сведчаць пра ўзнаўленне традыцый этнічнага вопыту выжывання ў неспрыяльных умовах, а менавіта пераемнасць адмысловых мадэлей паводзін і практык, якія пастаянна рэалізуюцца этнасам, як толькі падыходзіць крызісны час. Асабліва яскрава гэта праяўлася ў сферы жыццёвых стратэгій і адаптыўных практык вясковага насельніцтва. Напрыклад, палявыя матэрыялы пра пасляваеннае жабрацтва сведчаць пра пераемнасць мадэляў паводзін, прынятых у субкультуры дарэвалюцыйных жабракоў і ўзнаўленне традыцый этнічнага вопыту выжывання ў неспрыяльных умовах [4]. Паваенная КЖ шмат у чым працягвала і развівала экстрэмальны досвед перыяду вайны і акупацыі.

Ключавым кампанентам КЖ пасляваеннай беларускай вёскі выступае аднаўленне матэрыяльнай базы жыццядзейнасці. Адным з наступстваў вайны было зруйнаванне жылога і гаспадарчага фонду, недахоп элементарных рэчаў штодзённага ўжытку. Людзі былі вымушаны прыстасоўвацца да экстрэмальных умоў і шукаць варыянты часовага жылля, забяспечваць сябе адзеннем і абуткам, выкарыстоўваючы ўсе наяўныя рэсурсы. Вясковая грамада вярталася да традыцыйных спосабаў вытворчасці, да даматканай вопраткі і самаробнага абутку. У першыя гады пасля вызвалення зямлянкі, як часовае жыллё, былі рэаліяй найбольш пацярпелых раёнаў. Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра існаванне пераходнага тыпу жылля. Першыя хаты, якія будаваліся ў пасляваенны перыяд, былі невялікіх памераў і практычна былі пазбаўлены дэкаратыўна-мастацкага аздаблення. Акрамя гэтага адсутнічалі некаторыя элементы традыцыйнай вясковай сядзібы, якія ва ўмовах калгаснай сістэмы страцілі сваю актуальнасць (напрыклад, гумно). Цікавым прадстаўляецца вывучэнне тэхналогій будаўніцтва часовага жылля, яго тэхнічныя параметры, прынцыпы ацяплення, асьвятлення, санітарна-гегіенічныя ўмовы, а таксама наколькі паваеннае вясковае дойлідства пераняло ўзоры і традыцыі даваеннага часу, і ў якой ступені было дапоўнена канструктыўнымі і тэхналагічнымі навацыямі.

Архіўныя дакументы і матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што ў разглядаемы перыяд асноўную ролю ў жыццезабеспячэнні, як сялян-калгаснікаў, так і сялян-аднаасобнікаў, адыгрывала асабістая гаспадарка. Разам з тым, неабходна адзначыць, што ў першыя паваенныя гады назіраўся рэгрэс у развіцці агратэхнікі, адкат да ручной формы апрацоўкі зямлі. Пасляваенная вёска характарызавалася практычна поўнай адсутнасцю грашовых сродкаў, бо афіцыйная заработная плата калгаснікаў з большага насіла натуральны характар. У гэтай сітуацыі пераважаў тавараабмен, а неабходныя для аднаўлення гаспадаркі і выплаты падаткаў грошы

здабываліся розным, нават крымінальным спосабам. Прычым пошук грошай на свае патрэбы насіў сегментаваны характар: дзеці рэалізоўвалі прадукцыю ад промыслаў, даходы ад якой пакрывалі выдаткі, напрыклад, на адукацыю; дарослыя былі задзейнічаны пераважна ў нефармальных стратэгіях. Наратывы фіксуюць, што неспрыяльныя ўмовы пасляваеннай рэчаіснасці выклікалі да жыцця альбо актуалізавалі нетыповыя формы эканамічнай актыўнасці сялян, дзе сярод традыцыйных заняткаў паўсталі і нелегальныя формы гандлёвага прадпрымальніцтва (для атрымання матэрыяльных рэсурсаў) і ў першую чаргу – выраб і збыт самагону, бо гэта быў эфектыўны спосаб “канвертацыі” сельскагаспадарчай прадукцыі ў “жывыя грошы”. Пры гэтым сяляне ўсведамлялі, што гэта незаконны від дзейнасці, які караўся з боку дзяржавы, аднак страх перад пакараннем саступаў прагматычным меркаванням. Грошы ад продажу самагону інвеставаліся, перш за ўсё, на набыццё прадметаў першай неабходнасці і для аднаўлення ўласнай гаспадаркі.

Рэспандэнты адзначаюць, што ў першыя гады пасля вызвалення адчуваўся недахоп базавых прадуктаў харчавання (хлеб, мяса, малако, соль), а ў раёнах найбольш пацярпелых ад нацыстаў пагроза смерці ад голаду стала часткай рэчаіснасці. Ва ўмовах аднаўленчых працэсаў у паваенны час актуалізуецца роля і месца збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння, функцыянальнасць і эффектыўнасць якога былі абумоўлены канкрэтнымі прыроднымі ўмовамі мікрарэгіёну [5]. Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць, што менавіта дзікарослыя расліны, ва ўмовах недахопу базавых прадуктаў, з’яўляліся ў пасляваенны час вырашэннем праблемы харчавання. Прычым рэестр спажывання быў значна пашыраны за кошт тых зёлак і раслін, якія ва ўмовах адноснага дабрабыту практычна не выкарыстоўваліся ў ежу. Пасля таго, як знікла праблема галоднай смерці, збіральніцтва захоўвала актуальнасць, але вярталася да сваей класічнай формы, калі прадметам промысла выступалі грыбы, ягады, некаторыя расліны (шчаўе, крапіва і інш.). Збіральніцтва давала не толькі неабходныя харчовыя рэсурсы, але і featureзнага рода сыравіну для аднаўлення ўласнай гаспадаркі. У першыя пасляваенныя гады прадукты збіральніцтва з’яўляліся крыніцай дадатковых паступленняў у бюджэт сялянскай сям’і (продаж на рынку ці здача ў нарыхтоўчыя канторы). Увогуле, ва ўмовах складанай эканамічнай сітуацыі, адбывалася актуалізацыя разнастайных промыслаў, якія з’яўляліся важнымі дадатковымі крыніцамі жыццезабеспячэння і набылі ў вызначаны перыяд выразны камерцыйны характар.

Вельмі важным пытаннем у межах культуры жыццезабеспячэння беларускай паваеннай вёскі з’яўляецца яе этнадэмаграфічная характарыстыка. Падчас вайны загінула значная частка мужчын, якія былі асноўнай вытворчай сілай у мірны час. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да пераразмяркавання ролі жанчын, дзяцей і падлеткаў у пасляваеннай сістэме жыццезабеспячэння. Перспектыўным напрамкам даследавання з’яляецца “этнаграфія дзяцінства”, якая ў экстрэмальны паваенны час мае сваю выразную спецыфіку.

Такім чынам, культуру жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі можна вызначыць як сукупнасць гаспадарчых практык, навыкаў і ведаў, якія дазволілі забяспечыць жыццяздольнасць калектыву, былі абумоўлены і знаходзіліся ў цеснай ўзаемасувязі з геакліматычнымі асаблівасцямі этнічнай тэрыторыі, сацыяльнай арганізацыяй і ўзроўнем гістарычнага развіцця народа і яе асобных

частак. Вылучэнне і даследаванне праблематыкі жыццезабеспячэння беларускай пасляваеннай вёскі ўяўляецца перспектыўным ракурсам этнічнай культуры ў цэлым і можа выступаць як асобны прадмет этналагічнага даследаванняў, бо культура жыццезабеспячэння з'яўляецца важнейшым аспектам этнічнай культуры і без яе аналізу немагчыма характарыстыка матэрыяльнай, сацыяльнай і духоўнай культуры этнаса.

Літаратура

1. Культура жизнеобеспечения и этнос / Э. С. Маркарян, С. А. Артюнов. – Ереван : Изд-во АН АрмССР, 1983. – С. 319.
2. Лурье, С. В. Историческая этнология : Учеб. пособие для вузов / С.В. Лурье. – М., 2004. – С. 153.
3. Фурсина, Н. О. Практика устной истории : детские воспоминания о Великой Отечественной войне / Н. О. Фурсина // Вестник Таганрогского института имени А.П. Чехова. – 2016. – №1. – С. 280 – 286.
4. Сумко, А. В. Пасляваеннае жабрацтва ў дыскурсе вуснай гісторыі Віцебшчыны / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2020. – № 9. – С. 142–147.
5. Сумко, А. В. Збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2021. – № 1. – С.178 – 184.